***С.С. Мароз, г. Мінск***

# Сказы са значэннем пасесіўнасці ў сучаснай беларускай літаратурнай мове

Функцыянальна-семантычная катэгорыя пасесіўнасці ў сучаснай беларускай літаратурнай мове фарміруецца сродкамі, якія прэзентуюць розныя ўзроўні моўнай сістэмы. Да іх адносяцца прыналежныя і некаторыя іншыя разрады займеннікаў, прыналежныя і асобныя якасныя прыметнікі, формы роднага і давальнага склонаў назоўнікаў без прыназоўнікаў, дзеясловы *валодаць*, *мець*, *належаць* і пад., назоўнікі *гаспадар*, *гаспадыня*, *уладальнік*, *уладальніца* і пад., словазлучэнні з прыназоўнікамі *ў*, *ад*, *да*, *без* родным склонам імені і некаторыя іншыя.

Паколькі паводле семантыкі катэгорыя пасесіўнасці неаднародная – уключае дзве асноўныя субкатэгорыі (прыналежнасць і валоданне), – то адны са сказаў, сфарміраваныя пасесіўнымі сродкамі, перадаюць семантыку прыналежнасці, а другія – семантыку валодання.

Асноўны змест пасесіўных сказаў са значэннем прыналежнасці – указанне на суб’екта-пасэсара (уладальніка), якое рэалізуецца праз ўжыванне ў функцыі прэдыката займеннікаў і прыметнікаў са значэннем прыналежнасці: *Няўжо Чарноў гэты –* ***наш****?* (В. Быкаў. Пастка). *Я ... так хлопец... падарожны, праз сябе сам... я* ***нічый*** (Я. Колас. Сымон-музыка). *Адразу відно, што* ***рыбакова*** *жонка* (Л. Дайнека. След ваўкалака). [Анісся:] – *Усё ж такі – хата* ***свая*** (І. Мележ. Подых навальніцы). *Агарод тым часам можна і пашырыць – вядома, зямля тут* ***нічыйная****...* (Т. Хадкевіч. Песня Дзвіны). *“Якая гэта Таццяна? Вёскі якой?” – “Ды* ***нашынская*** *... Таццяна”* (М. Лынькоў. На чырвоных лядах). – ***Чые*** *авечкі?* (І. Мележ. Людзі на балоце). Галоўным кампанентам у такіх сказах выступае назоўнік, што абазначае аб’ект прыналежнасці, бо ўжываецца ў форме назоўнага склону, а слова, што называе суб’екта-пасэсара (прыметнік, займеннік), з’яўляецца граматычна залежным. Парадак размяшчэння кампанентаў звычайна такі: на першым месцы – назоўнік-пасэсум (аб’ект прыналежнасці), на другім – прыметнік (займеннік) – пасэсар. Пры інверсійным парадку крытэрыем для аднясення вызначаных займеннікавых і прыметнікавых канструкцый да прэдыкатыўных служыць лагічны націск: інтанацыйнае ўзмацненне прыпадае на выказнік, які акрэслівае, характарызуе дзейнік: *Ці хадзіў, ці стаяў* [Васіль] *... злыя думкі тачылі: “Жонка будзе!..* ***Карчова*** *жонка”* (І. Мележ. Людзі на балоце). – ***Наш*** *бусел! – ганарыста гаворыць Міколка (*М. Лынькоў. Всількі). *Кожны, паглядзеўшы на іх* [дзяцей]*, сказаў бы: –* ***Кагутова*** *племя* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім). – ***Дзянісава*** *гэта багацце, – нявесела прамовіў Белавалод* (Л. Дайнека. След ваўкалака). *Абы* ***мае*** *бярозкі, а дубкі будуць* (Прыказка).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Значэнне прыналежнасці (указанне на суб'екта-пасэсара) перадаюць таксама і сказы з дзеясловам *належаць,* які рэалізуе сему 'быць (з'яўляцца) уласнасцю' : *Сёмку Фартушніку **належала** карчма на гасцінцы* (К. Чорны. Трыццаць год). *У сапраўднасці ж яна* [хата] ***належала** дзедавай жонцы, цяпер бабцы Настулі* (Я. Колас. Дрыгва). *... палі і лясы на дзесяткі вёрст вакол маёнтка **належалі** яму* [памешчыку] (С. Грахоўскі. Рудабельская рэспубліка). *Радзівілам у сярэднія вякі **належала** таксама і Койданава* (М. Ткачоў. Замкі і людзі). *Пра гэта расказваюць фотаздымкі, дакументы, зброя, якая **належала** героям* (В. Вольскі. Кніга падарожжаў). Парадак размяшчэння кампанентаў у такіх сказах вольны: назоўнік-пасэсар (у форме давальнага склону) і назоўнік-пасэсум (у форме назоўнага склону) могуць размяшчацца ў прэ- і ў постпазіцыі адносна адно аднаго. Адзначым, што ўказанне на суб'екта-пасэсара выяўляецца больш выразна пры яго постпазіцыі.

Асноўны змест пасесіўных сказаў са значэннем валодання – указанне на аб'ект-пасэсум. Большасць такіх канструкцый фарміруецца пры дапамозе дзеясловаў *валодаць, мець, трымаць* і пад., якія рэалізуюць семы 'быць (з'яўляцца) уладальнікам' 'не быць (не з'яўляцца) уладальнікам': *Вотчынай Рагвалодавых унукаў **валодаюць** Яраславічы* (Л. Дайнека. След ваўкалака). *Дзве трэці зямлі, якой **уладаў** да вызвалення мужык, пераходзяць да яго без выкупу* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім). *З 1774 г. горадам **валодалі** Радзівілы* (М. Ткачоў. Замкі і людзі). *Богут касавокі **мае** тры валокі* (Я. Колас. Рыбакова хата). *Купцова дзяўчынка была ўжо замужам, **мела** дзяцей* (Я. Брыль. Нёманскія казакі). *Бабка Параска была круглая бабулька: **не мела** ні мужа, ні дзяцей* (Я. Колас. На ростанях). *Права на спадчыну ён* [дзед] ***не меў*** (В. Адамчык. Чужая бацькаўшчына). *Але калі ... яна* [Таіса] *пагаварыла з настаўніцай Кусянковай, якая **трымала** карову, Таісіна рашучасць купіць карову* знікла (І. Шамякін. Вазьму твой боль). *Пры панах ён* [чалавек] … ***трымаў** у недалёкай вёсцы краму…* (Я. Брыль. На Быстранцы). Ілюстрацыі сведчаць, што пры прамым парадку кампанентаў пасесіўнай канструкцыі (назоўнік-пасэсар у прэпазіцыі адносна назоўніка-аб'екта) указанне на прадмет валодання выяўляецца больш выразна.

Сказы са значэннем пасесіўнасці (пераважна з указаннем на аб'ект-пасэсум) могуць фарміравацца і шматлікімі дзеясловамі са значэннем дынамічных пасесіўных адносін. Дынамічныя пасесіўныя адносіны – гэта такія адносіны, якія выражаюць не статычнае, а актыўнае валоданне чым-небудзь. Калі для дзеясловаў са статычнымі пасесіўнымі адносінамі ўласцівыя семы 'быць (з'яўляцца) уладальнікам' і 'не быць (не з'яўляцца) уладальнікам', то для апошніх характэрны семы 'зрабіцца (станавіцца) уладальнікам' і 'перастаць быць уладальнікам': … [Міхал] *каня, кароўку **расстараўся**, **завёў** свіней, дзве-тры авечкі* (Я. Колас. Новая зямля ). *Аназаўтра яна* [Аміля] ***дастала** заядлага сабаку* … (К. Чорны. Трыццаць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

год). ***Купілі*** *яны* [Ядрэйка і Васіль] *коніка, фурманку і паехалі праз лясы ў свой Менск* (Л. Дайнека. След ваўкалака). *Ён* [бацька] *залез у даўгі ... і* ***купіў*** *сабе пад Слуцкам кавалак зямлі* (Я. Скрыган. Кругі). *Фальварак Кушляны Ашмянскага павета* ***набылі*** *продкі Францішака Багушэвіча яшчэ ў сярэдзіне XVIII стагоддзя* (“Полымя”). *Дзве каровы* ***прадалі*** [Дарошкі], *а потым і каня* (Б. Сачанка. Вялікі Лес).

У спецыяльнай літаратуры сказы, якія выражаюць прыналежнасць (указваюць на суб’екта-пасэсара), называюцца “посессивными предложениями” [2, с. 11 – 12], а сказы са значэннем валодання (указваюць на аб’ект-пасэсум) – “предложениями посессивного наличия” [1, с. 11]. Да апошніх адносяцца і сказы, сфарміраваныя дзеясловам *ёсць* і прыназоўнікам *у*: *У мяне ж* ***ёсць*** *свая хатка* (Я. Колас. Сымон-музыка). [Клопікаў:] – *Дзеці ж* ***ёсць*** *у вас?* (М. Лынькоў. Векапомны дні). [Усяслаў:] – *Хіба ў мяне* ***ёсць*** *хвост?* (Л. Дайнека. След ваўкалака). ... *у гэтую хвіліну* [поп] *шкадаваў, што ў яго* ***ёсць*** *рукі* (Я. Колас. На ростанях.) *У нас* ***ёсць*** *дружба…* (Я. Брыль).Звычайна дзеяслоў *ёсць* у форме цяперашняга часу ўжываецца ў сказах, дзе гаворыцца ўвогуле пра наяўнасць аб’екта ў пасэсара. Калі трэба звярнуць увагу на адметнасць аб’екта, то дзеяслоў *ёсць* апускаецца ці мае форму прошлага часу і выконвае ролю звязкі пры іменнай частцы, выражанай прыметнікам, дзеепрыметнікам і інш.: *...твар у Хадоські вельмі* ***ўзрушаны***, ***няшчасны*** (І. Мележ. Людзі на балоце). *Слых* ***напружаны*** *ў Андрэя Андрэевіча* (М. Лынькоў. Баян). *Заднія ногі ў лася* ***былі белыя*** (І. Пташнікаў. Тартак). *Твар у яе* [Клавы] ***быў дробны і белы*** (К. Чорны. Бацькаўшчына). У такіх сказах назоўнік-пасэсум – найменне аб’екта абсалютнай, адноснай ці аказіянальнай неадчужальнасці.

Назіранні над фактычным матэрыялам сведчаць, што ў межах складанага сказа пасесіўны сэнс выражае, як правіла, адна з яго частак: Ён [Даніла] ведаў, *што ёй* [дачцы] *належаць дзве тысячы душ…* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім). *Інжынер меў такі выгляд*, быццам толькі што вылез з рэчкі… (І. Шамякін. У добры час). Вяскоўцы вырашылі, што кожны гаспадар, *які трымае карову*, павінен па чарзе адпасваць адзін дзень (“Маладосць”). У пісьмовых крыніцах Плешчаніцы вядомы з 18 ст., *мястэчка належала Тышкевічам…* (БелСЭ, т. 8). І вось мы зноў пад Мінскам, *які належыць цяпер полацкаму князю Усяславу Чарадзею* (В. Вольскі. Кніга падарожжаў”). Прывез яе [лодку] на параконнай фурманцы старшына Белуш, які тут жа … аб’явіў, *што лодка належыць самому каменданту – капітану Зарубіну…* (В. Быкаў. Дажыць да світання). У межах складаназалежнага сказа дадзеныя часткі з пасесіўным сэнсам найчасцей выконваюць у адносінах да галоўнай дапаўняльную і азначальную функцыі, але могуць перадаваць і іншыя адносіны: Яна [Ніна] ніколі не дазволіць узяць сабе хоць маленькую капялютачку таго, *што належыць ёй* [Марыне] (М. Лобан. Шэметы). Прайшоўшы на другую палавіну хаты, *якая цалкам цяпер належала*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Масею*, бацька спыніўся насупраць акна (І. Чыгрынаў. Апраўданне крыві). Усяслаў перакананы, … *што нашы прадзеды мелі сваю, не горшую, чым хрысціянства, веру* (Л. Дайнека. След ваўкалака). Вядома ж палачане, *якія мелі сваю княскую дынастыю*, не маглі змірыцца з прадстаўніком чужой дынастыі (М. Ермаловіч. Старажытная Беларусь: Полацкі і новагародскі перыяды). Не толькі ў нашым сяле лічылася, *што Нямко валодае незвычайнай сілай* (А. Кулакоўскі. Нявестка). Бедны хопчык быў загнаны, у бацькоў нялюбы сын, *бо відочныя заганы і меў толькі ён адзін* (Я. колас. Сымон-музыка). *Хто мае дочкі*, той ходзіць без сарочкі, *а хто мае сынкі,* той пячэ блінкі (Прыказка). Працавалі многа, *як быццам пан Кроер меў не тысячу душ, а нейкіх няшчасных сто* (У. Караткевіч. Калася пад сяропм тваім).

Такім чынам, багаты набор сродкаў выражэння пасесіўнасці ў сучаснай беларускай літаратурнай мове абумоўлівае структурную і семантычную разнастайнасць сказаў са значэннем пасесіўнасці.

Спіс літаратуры


1. Аношкина, Т.Е. Предложения со значением посессивного наличия в современном русском языке («у + род.п. + (есть) + им. п.»): автореф. дис. … канд. филол. наук: 10. 02. 01 / Т.Е. Аношкина: Московск. гос. пед. ин-т им. В.И. Ленина. Москва, 1984. – 16 с.

2. Арефьева, Т.Л. Система и функционирование средств выражения принадлежности в современном русском языке: дис. канд. филол. наук: 10.02.01 / Т.Л. Арефьева; Ин-т русского языка им. А.С. Пушкина. Москва, 1986. – 224 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ